# Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Гомельская вобласць, Светлагорскі раён





# ЯК УМАЦАВАЦЬ ПРЭСТЫЖ РАЁНА?

## Адказ на гэтае пытанне мы знайшлі ў Светлагорскім раёне Гомельшчыны

**Летась па выніках Рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры» ў намінацыі «Найлепшы горад раённага падпарадкавання» пераможцам прызнаны Светлагорск. У Год малой радзімы тут таксама ажыццяўляецца маштабная работа па добраўпарадкаванні не толькі райцэнтра, але і сельскіх населеных пунктаў.**

**Старшыня Светлагорскага райвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ** адзначае, што сёлета важна не дапусціць зніжэння дасягнутых вынікаў і ў аграпрамысловым комплексе, а таксама стварыць спрыяльныя ўмовы для адкрыцця новых прадпрыемстваў.

**Светлагорскі раён займае плошчу амаль 190 тысяч га. У райцэнтры жыве каля 69 тысяч чалавек, у сельскай мясцовасці – 16 тысяч.**

**У раёне працуюць 44 арганізацыі аховы здароўя, 65 устаноў адукацыі, пяць спецыялізаваных навучальна-спартыўных устаноў. У Светлагорскім раёне культывуецца 15 алімпійскіх відаў спорту.**

**На тэрыторыі раёна дзейнічаюць 63 арганізацыі культуры. У іх ліку пяць дзіцячых школ мастацтваў, раённы гісторыка-краязнаўчы музей, мастацкая галерэя...**

**Турыстычная інфраструктура раёна прадстаўлена 46 помнікамі гісторыі, археалогіі, архітэктуры і культуры, занесенымі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.**



— У нас атрымалася летась захаваць станоўчую дынаміку самых важных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечыць выкананне прагнозных паказчыкаў па экспарце тавараў, вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, па ўводзе ў дзеянне жылых дамоў. У 2017-м з'явіліся 26 новых арганізацый, у тым ліку 11 — у вытворчай сферы. Зарэгістравана 236 індывідуальных прадпрымальнікаў. На суму больш за 400 млн рублёў выраблена прамысловай прадукцыі. Аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў фактычных цэнах павялічыліся на 11 %.

***— Якія інвестыцыйныя праекты рэалізоўваюцца прамысловымі прадпрыемствамі раёна?***

— У адкрытым акцыянерным таварыстве «Светлагорскхімвалакно» ўжо створана больш за сорак новых працоўных месцаў. Там уведзена ў эксплуатацыю ўстаноўка па рэгенерацыі адходаў ацэтону, пашырана вытворчасць мяккіх разавых кантэйнераў тыпу «біг-бег», у стадыі рэалізацыі праект «Пашырэнне вытворчасці нятканых матэрыялаў будаўнічага прызначэння». У адкрытым акцыянерным таварыстве «Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат» завяршаецца рэалізацыя праекта «Будаўніцтва завода па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы» магутнасцю 400 тысяч тон у год. Увогуле ж летась за кошт стварэння новай вытворчасці з'явілася 67 новых працоўных месцаў. Прадпрыемствы раёна выходзяць на новыя рынкі. Дзевяць краін у 2017 годзе сталі партнёрамі па знешнеэканамічнай дзейнасці. У іх ліку Азербайджан, Сербія, Кіпр, Македонія. У параўнанні з 2016 годам у раёне павялічыўся экспарт турыстычных, будаўнічых, дзелавых паслуг, а таксама паслуг аховы здароўя.



**Вятрак — галоўная выдатнасць сядзібы «Міколін Востраў». 27-метровы млын быў пабудаваны ў XIX стагоддзі і з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю нашай краіны.**

***— Якія тэндэнцыі назіраюцца ў сельскай гаспадарцы?***

— На ўзроўні больш чым 105 % тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі ў грамадскім сектары, вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі і раслінаводства. У гаспадарках Светлагоршчыны праведзена значная работа па абнаўленні тэхнічнай базы і рэканструкцыі жывёлагадоўчых аб'ектаў. Летась працаўнікамі вёскі выраблена 55 тысяч тон малака, вырашчана амаль 16 тысяч тон прадукцыі раслінаводства.

***— Якім чынам жыхары горада і раёна адчуваюць тыя змены, якія адбываюцца ў вытворчым сектары?***

— У эксплуатацыю ўведзена 45 індывідуальных жылых дамоў. Пабудавана 17 тысяч квадратных метраў жылля ў шматкватэрных дамах. Больш як восемдзесят сем'яў адсвяткавалі ўваходзіны. Добраўпарадкаваны дарогі і гарадскія вуліцы, пастаянна ажыццяўляецца капітальны рамонт жыллёвага фонду. Адкрыліся 23 новыя крамы. Палепшылася якасць аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву ўстановамі аховы здароўя раёна.

**— Дзмітрый Вадзімавіч, раскажыце пра дасягненні маладых жыхароў Светлагоршчыны.**

— За мінулы год у скарбонцы перамог нашых школьнікаў і навучэнцаў — 82 дыпломы абласной і рэспубліканскай алімпіяд. 90 дыпломаў яны атрымалі ў інтэрнэт-віктарынах, інтэрнэт-алімпіядах, інтэлектуальных конкурсах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. 615 прызавых месцаў заваявалі нашы спартсмены ў спаборніцтвах абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. У аснове ўсіх дасягненняў — вынік добрасумленнай працы і высокай ступені адказнасці за дaручаную справу кожнага, хто памножыў



**Помнік Раману Шацілу, легендарнаму заснавальніку Шацілак, знаходзіцца на галоўнай плошчы горада, які стаіць на беразе ракі Бярэзіны. На старонкі пісьмовых крыніц селішча трапіла яшчэ ў XVI стагоддзі. Між тым гісторыкі лічаць, што з VI—VII стагоддзя дакладна можна казаць пра існаванне жыцця на гэтай тэрыторыі. У 1961 годзе Шацілкі перайменавалі ў Светлагорск.**

поспехі раёна. Нас усіх аб'ядноўвае тое, што сваю плённую працу, веды і энергію мы накіроўваем на ўмацаванне прэстыжу Светлагорскага раёна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



Рака Бярэзіна.

*** Сіняе возера знаходзіцца за 16 км ад Светлагорска, каля вёскі Пагонцы. Вада ў возеры насычана серавадародам і мае паніжаную кіслотнасць. З-за гэтага флора і фаўна вельмі бедныя. У народзе возера часцей завуць Мёртвым. Жыхары расказваюць, што яно нібыта з'явілася на месцы вёскі, якая сышла на дно разам з царквой. Раней, кажуць, там мылі бялізну, як у пральні: «мёртвая» вада яе адбельвала.**





**Памятны знак «Баграціён» адкрыты ў юбілейны год 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя «Баграціён» — самая ўдалая летняя ваенная аперацыя Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне. На тэрыторыі мемарыяла знаходзіцца музей, а таксама бліндажы і фрагменты ваенна-інжынерных пераправаў, узоры баявой тэхнікі і ўзбраенняў.**



**Скульптурная кампазіцыя «Звон» — брацкая магіла савецкіх воінаў, якая знаходзіцца ў Светлагорску на скрыжаванні вуліц Савецкай і Сацыялістычнай. На гэтым месцы былі перапахаваны 257 воінаў, якія загінулі ў баях пры вызваленні вёскі Шацілкі і тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

## ЮНЫЯ ТАЛЕНТЫ СВЕТЛАГОРШЧЫНЫ

14-гадовая Ганна Севярын, спартсменка са Светлагорска, адна з чатырох беларусак, хто будзе прадстаўляць Беларусь на міжнароднай арэне. Дзяўчынка займаецца ў ДЮСШ № 1 і выступіць на Сусветнай гімназіядзе школьнікаў, якая пройдзе з 2 да 9 мая ў Марока.

***

Светлагорская спартсменка Аліна Гвоздзь зусім нядаўна стала чэмпіёнкай Рэспублікі Беларусь па тэквандо сярод дарослых. У спаборніцтвах прыняло ўдзел каля ста спартсменаў 2001 года нараджэння і старэйшыя.

***

Выпускніца Светлагорскай школы мастацтваў Ксенія Міхальчанка скарыла IV Міжнародны фестываль-конкурс «Новыя вяршыні — 2018».

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ПРЫНОСІЦЬ ПЛЁН

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў актыўна супрацоўнічае з прыходам храма Велікамучаніцы Варвары аграгарадка Баравікі, што пад Светлагорскам.

У Год малой радзімы тут пабываў зямляк, прафесар установы Уладзімір Зінкевіч. Супрацоўніцтва пачалося з арганізацыі ў Баравіках выставы сусветных шэдэўраў — спісаў абразоў Феафана Грэка, Андрэя Рублёва, Дзіянісія. Іх стваралі студэнты акадэміі ў старажытных расійскіх храмах. Цяпер студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па прапанове архімандрыта Аляксія (Жалянка) прыступілі да работы над здымкамі дакументальнага фільма, прысвечанага трагічнаму лёсу вёскі Ала Светлагорскага раёна. Каля дзвюх тысяч яе жыхароў у 1944 годзе былі знішчаны фашыстамі. Таксама кіраўніцтва Беларускай акадэміі мастацтваў прапануе правядзенне ў Баравіках рэспубліканскага мастацкага пленэру.

# СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЕРАЦЫЯ ЦЯПЕР ПРАЦУЕ І НА ЭКСПАРТ

**Светлагорскае райспажыўтаварыства — шматгаліновая арганізацыя, якая займаецца гандлёвай, нарыхтоўчай, вытворчай дзейнасцю, аказаннем розных паслуг насельніцтву. Яго калектыў паспяхова выконвае вельмі важную сацыяльную функцыю: забяспечвае гандлёвае абслугоўванне сельскіх жыхароў, закупляе ў іх лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны, арганізуе перапрацоўку і пастаўку ў рознічную сетку.**



**Старшыня праўлення Алена Лапцева**

63 стацыянарныя крамы гандлёвай плошчай звыш 6600 кв. м абслугоўваюць 16 тысяч чалавек. Пяць аўтакрам тры разы на тыдзень прывозяць тавары жыхарам малых населеных пунктаў. У структуры Светлагорскага райспажыўтаварыства працуюць 32 стацыянарныя прадпрыемствы грамадскага харчавання на 1622 пасадачныя месцы.

За мінулы год аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі склаў 3230 тыс. руб., а тэмп росту ў супастаўных цэнах 110,7 %. Для забойнага цэха закупляецца жывёла ў мясцовага насельніцтва і сельгасвытворцаў. У цэху па вытворчасці мясных паўфабрыкатаў іх вырабляюць у месяц каля 40 тон. Пякарня прапануе больш за 30 найменняў хлебабулачных вырабаў.

Нарыхтоўчая галіна з'яўляецца толькі часткай эканамічнага патэнцыялу спажывецкай кааперацыі раёна. Яе дзейнасць накіравана на павелічэнне аб'ёмаў закупаў сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны ў асабістых гаспадарках жыхароў сяла, чым спрыяе росту прыбыткаў вяскоўцаў.

Аб'ём закупу сельскагаспадарчай прадукцыі летась склаў 5155 тыс. руб., што забяспечыла першае месца па аблспажыўсаюзе. Нарыхтавана мяса 777 тон, што на 245 тон больш, чым у 2016 годзе, гародніны — 277 тон, чарніц — 34 тоны (яе, дарэчы, замарожваюць і адпраўляюць на экспарт). Акрамя таго, сабралі ў насельніцтва 1023 тоны макулатуры — гэта ў 1,5 раза больш, чым у 2016-м. Лому чорных металаў — 5990 тон, шклабою — 280 тон, поліэтылену — 77 тон.



Па выніках 2017 года Светлагорскае райспажыўтаварыства выканала пяць з шасці прагнозных паказчыкаў, зацверджаных аблспажыўсаюзам: забяспечыла рост тавараабароту грамадскага харчавання, аб'ёму закупу сельгаспрадукцыі і сыравіны, аб'ёму вытворчасці прамысловай прадукцыі, экспарту, захавала добры паказчык па энергазберажэнні. Упершыню ў гісторыі Светлагорскага райспажыўтаварыства знешнеэканамічны абарот склаў больш за адзін мільён долараў. Ад гэтай дзейнасці светлагорскія кааператары атрымалі звыш 373 тыс. руб. валавых прыбыткаў.

Узорным гандлёвым аб'ектам Светлагорскага райспажыўтаварыства з'яўляецца ўніверсам «Кастрычніцкі». У ім размешчаны аддзел «Мясная лаўка», дзе можна купіць незвычайныя прадукты: мяса труса, індычкі, дыетычную бараніну і іншае. У кандытарскім аддзеле прадстаўлена смачная свежая прадукцыя ўласнай вытворчасці і тавары айчынных вытворцаў. Тавары з крамы можна набыць і праз інтэрнэт.

У маладзёжным мікрараёне размешчана крама «Жамчужына Палесся», дзе рэалізуюцца прамысловыя тавары. Тут можна купіць канцтавары, цацкі, посуд, гаспадарчыя тавары, парфумерна-касметычныя тавары, швейныя вырабы ўласнай вытворчасці, бялізнавы трыкатаж, панчошна-шкарпэткавыя вырабы і іншае.

Летась праўленнем Белкаапсаюза і прэзідыума рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў спажывецкай кааперацыі праўленню райспажыўтаварыства прысуджаны «Ганаровы знак» у намінацыі «За высокія дасягненні ў нарыхтоўчай дзейнасці» па выніках працы за 2016 год.

Пастановай праўлення Гомельскага аблспажыўсаюза і прэзідыума абкама прафсаюза работнікаў спажыўкааперацыі прысуджаны дыплом за першае месца — за дасягненне найлепшых паказчыкаў у фінансава-гаспадарчай дзейнасці за 2016 год.


УНП 400019934


# ВЫКЛЮЧНАЯ ЯКАСЦЬ

Рашэнне аб утварэнні Светлагорскага завода жалезабетонных вырабаў і канструкцый было прынята 1 студзеня 1959 года, і на працягу ўсяго часу завод адрозніваўся выключнай якасцю сваіх вырабаў. Распрацаваныя спецыялістамі канструкцыі ў сукупнасці з найноўшым абсталяваннем заявілі пра Светлагорскі завод ЖБВіК як пра моцнага канкурэнта на рынку постсавецкай прасторы. Сёння больш за 80 % сваёй прадукцыі ў вартасным выражэнні завод адгружае за мяжу, пастаянна супрацоўнічае з такімі краінамі, як Расія, Літва, Латвія, Эстонія і Азербайджан.

Усяго завод выпускае каля 400 марак і 200 тыпаразмераў вырабаў з жалезабетону. Праводзячы сумесную работу са спецыялістамі праектных і навукова-даследчых арганізацый, сярод якіх «Сельэнергасеткапраект» (г. Масква), «Энергасеткапраект» (г. Санкт-Пецярбург), БНТУ (г. Мінск), Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый вядзе прадуктыўную работу па праектаванні і стварэнні новых відаў прадукцыі, такіх як жалезабетонныя пліты ПАГ для ўстройства зборных аэрадромных пакрыццяў, цэнтрыфугіраваныя апоры канатнага арміравання. Цяпер у Беларусі вядзецца актыўнае ўкараненне сістэм забеспячэння бяспекі пры арганізацыі дарожнага руху. Для выканання гэтых задач на прадпрыемстве арганізавана вытворчасць жалезабетонных блокаў утрымальных агароджаў, прызначаных для ўстаноўкі на абочыне аўтамабільных дарог, на цэнтральнай раздзяляльнай паласе аўтамабільных дарог, маставых збудаванняў і тунэляў.

Важнай падзеяй у вытворчай дзейнасці завода з'яўляецца пастаноўка на вытворчасць секцыянаваных стоек СК па спецыяльна распрацаванай Маскоўскім праектным інстытутам серыі рабочых чарцяжоў і тэхнічных умоў. Для вытворчасці гэтых стоек СК прадпрыемствам атрыманы Еўразійскі патэнт.

Вялікая ўвага ўдзяляецца і сацыяльна-бытавому аснашчэнню завода. Для работнікаў, гараджан і гасцей горада функцыянуе сталовая, кафетэрый, банкетная зала, інтэрнат і гасцініца. З нядаўняга часу ўведзены ў дзеянне сучасны лазнева-аздараўленчы комплекс.

Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый — гэта сучасны комплекс па вытворчасці жалезабетонных вырабаў і канструкцый, які мае магутную вытворча-тэхнічную базу, дасведчаных спецыялістаў, гатовых выпускаць вырабы, якасць якіх прызнана не толькі на беларускім, але і на замежным рынку.


УНП 40005115


